ПАСТАНОВА САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
23 лістапада 2020 г. № 670

# Аб змяненні пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 10 студзеня 2009 г. № 18

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Унесці ў Палажэнне аб Ганаровай грамаце Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, зацверджанае пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 10 студзеня 2009 г. № 18, наступныя змяненні:

пункт 1 пасля слоў «дзяржаў за» дапоўніць словам «значныя»;

пункт 2 пасля часткі другой дапоўніць часткай наступнага зместу:

«Прадстаўленне да ўзнагароджання Ганаровай граматай грамадзян Рэспублікі Беларусь можа ажыццяўляцца пры ўмове, што яны ўжо былі ўзнагароджаны ці адзначаны граматамі і (або) падзякамі дзяржаўных органаў, дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, ці іх кіраўнікоў, за выключэннем:

асоб, узнагароджаных дзяржаўнымі ўзнагародамі, адзначаных Падзякай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

кіраўнікоў (іх намеснікаў) рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь;

старшынь (іх намеснікаў) абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў;

работнікаў Апарату Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь;

асоб, якія прадстаўляюцца да ўзнагароджання Ганаровай граматай па ініцыятыве Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.»;

у пункце 5:

пасля слоў «Дзяржаўнага сакратарыята Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь» і «Нацыянальнага статыстычнага камітэта,» дапоўніць пункт адпаведна словамі «, Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь» і «членаў Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, работнікаў»;

словы «падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь» замяніць словамі «падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, работнікаў Апарату Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь»;

пункт 6 дадатка 1 да дадзенага Палажэння выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«6. Ці ўзнагароджваўся, адзначаўся раней Падзякай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Падзякай Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь, граматамі дзяржаўных органаў, дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, ці падзякамі іх кіраўнікоў і даты ўзнагароджання, адзнакі ________________________________________________».

2. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання.

**Прэм’ер-міністр Рэспублікі Беларусь** **Р.Галоўчэнка**